УДК 069(476)

# ФОРМИРОВАНИЕ ФОНДОВ МУЗЕЕВ ВЫСШИХ УЧЕБНЫХ ЗАВЕДЕНИЙ БССР В 1920–30-х гг. (НА ПРИМЕРЕ УЧЕБНЫХ КОЛЛЕКЦИЙ БЕЛОРУССКОГО ГОСУДАРСТВЕННОГО УНИВЕРСИТЕТА)

***Д. И. ПРИГОДИЧ***[1)]

[1)]*Белорусский государственный университет, пр. Независимости, 4, 220030, г. Минск, Беларусь*

Рассматривается процесс комплектования фондов музеев высшей школы БССР в 1920–30-х гг. на примере формирования научных коллекций музеев БГУ. Для исследования проблематики фондовой деятельности музея привлекались общенаучные методы анализа, синтеза, описания, классификации с опорой на принцип историзма. Основой источниковедческой базы стали материалы фонда 205 Национального архива Республики Беларусь, отражающие историю деятельности БГУ. Изучение источников и способов поступления музейных предметов в фонды университетских музеев позволило рассмотреть особенности учебных музеев, определить приоритетные направления комплектования, раскрыть специфику их финансовой деятельности, выявить организации, способствующие фондовой деятельности, охарактеризовать способы поступления предметов музейного значения. Основными формами комплектования фондов музеев БГУ являлись передача в дар (от ученых, крупных музеев, учебных и научных

**Образец цитирования:**
Прыгодзіч ДІ. Фарміраванне фондаў музеяў вышэйшых навучальных устаноў БССР у 1920–30-я гг. (на прыкладзе вучэбных калекцый Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта). *Часопіс Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта. Гісторыя.* 2020;1:78–84.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-1-78-84.

**For citation:**
Pryhodzich DI. Formation of museums of higher educational institutions of the BSSR in 1920–30s (on the example of training collections of the Belarusian State University). *Journal of the Belarusian State University. History.* 2020;1:78–84. Belarusian.
https://doi.org/10.33581/2520-6338-2020-1-78-84.

**Автор:**
***Дарья Игоревна Пригодич*** – аспирантка кафедры этнологии, музеологии и истории искусств исторического факультета. Научный руководитель – доктор исторических наук, профессор А. А. Гужаловский.

**Author:**
***Darya I. Pryhodzich***, postgraduate student at the department of ethnology, museology and history of arts, faculty of history.
*daryapryhodzich@gmail.com*



CC BY NC

учреждений, организаций), сбор предметов музейного значения в ходе различных научных экспедиций, командировок, изготовление экспонатов в учебных мастерских учеными и студентами университета, обмен и официальное приобретение музейных предметов. Сочетание различных форм и направлений формирования фондов музеев БГУ обеспечило университет систематизированными научно организованными учебными коллекциями. Качественная и количественная характеристика и полнота и системность фондов определили высокий научный уровень развития учебных музеев БГУ.

***Ключевые слова:*** БССР; Белорусский государственный университет; музей высшей школы; музейный предмет; коллекция; фонд; экспедиция.

# ФАРМІРАВАННЕ ФОНДАЎ МУЗЕЯЎ ВЫШЭЙШЫХ НАВУЧАЛЬНЫХ УСТАНОЎ БССР У 1920–30-я гг. (НА ПРЫКЛАДЗЕ ВУЧЭБНЫХ КАЛЕКЦЫЙ БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ЎНІВЕРСІТЭТА)

***Д. І. ПРЫГОДЗІЧ***[1]

[1*]*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, пр. Незалежнасці, 4, 220030, г. Мінск, Беларусь*

Разглядаецца працэс камплектавання фондаў музеяў вышэйшай школы БССР у 1920–30-я гг. на прыкладзе фарміравання навуковых калекцый музеяў БДУ. Для даследавання праблематыкі фондавай дзейнасці музея прыцягваліся агульнанавуковыя метады аналізу, сінтэзу, апісання, класіфікацыі з апорай на прынцып гістарызму. Асновай крыніцазнаўчай базы сталі матэрыялы фонду 205 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, якія адлюстроўваюць гісторыю дзейнасці БДУ. Вывучэнне крыніц і спосабаў паступлення музейных прадметаў у фонды ўніверсітэцкіх музеяў дазволіла разгледзець асаблівасці вучэбных музеяў, вызначыць прыярытэтныя напрамкі камплектавання, раскрыць спецыфіку іх фінансавай дзейнасці, выявіць арганізацыі, якія дапамагаюць фондавай дзейнасці, ахарактарызаваць спосабы паступлення прадметаў музейнага значэння. Асноўнымі формамі камплектавання фондаў музеяў БДУ з'яўляліся перадача ў дар (ад вучоных, буйных музеяў, навучальных і навуковых устаноў, арганізацый), збор прадметаў музейнага значэння ў ходзе розных навуковых экспедыцый, камандзіровак, выраб экспанатаў у вучэбных майстэрнях навукоўцамі і студэнтамі ўніверсітэта, абмен і афіцыйнае набыццё музейных прадметаў. Спалучэнне розных форм і кірункаў фарміравання фондаў музеяў БДУ забяспечыла ўніверсітэт сістэматызаванымі, навукова арганізаванымі вучэбнымі калекцыямі. Якасная і колькасная характарыстыкі, паўната і сістэмнасць калекцый вызначылі высокі навуковы ўзровень развіцця вучэбных музеяў БДУ.

***Ключавыя словы:*** БССР; Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт; музей вышэйшай школы; музейны прадмет; калекцыя; фонд; экспедыцыя.

# FORMATION OF MUSEUMS OF HIGHER EDUCATIONAL INSTITUTIONS OF THE BSSR IN 1920–30s (ON THE EXAMPLE OF TRAINING COLLECTIONS OF THE BELARUSIAN STATE UNIVERSITY)

***D. I. PRYHODZICH***[a]

[a]*Belarusian State University, 4 Niezaliežnasci Avenue, Minsk 220030, Belarus*

The article discusses the process of acquiring the funds of the museums of the higher school of the BSSR in the 1920–30s on the example of the formation of scientific collections of the museums of the Belarusian State University. To study the problems of the stock activities of the museum, general scientific methods of analysis, synthesis, description, classification based on the principle of historicism were used. The source base is belt on materials from the fund 205 of the National Archives of the Republic of Belarus that reflects the history of the BSU. The study of the sources and methods of receipt of museum items in the funds of university museums made it possible to consider the features of educational museums, identify priority areas for acquisition, reveal the specifics of the financial activities of museums, find organizations that contribute to fund activities, and characterize the ways in which museum items are received. The main forms of acquiring the funds of the BSU museums were donation (from scientists, major museums, educational and scientific institutions, organizations), collection of museum items during various scientific expeditions, business trips, production of exhibits in training workshops by scientists and university students, exchange and official acquisition of museum items. The combination of various forms and directions of forming the funds of the BSU museums provided the university with systematized, scientifically organized educational collections. Qualitative and quantitative characteristics, completeness and systematic character of the collections determined the high scientific level of development of educational museums of the BSU.

***Keywords:*** BSSR; Belarusian State University; university museum; museum item; collection; fund; expedition.

## Уводзіны

Музеі вышэйшых навучальных устаноў на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь маюць багатую гісторыю, аднак асаблівасці іх развіцця да сённяшняга часу застаюцца практычна неразгледжанымі. Даследаванне працэсу фарміравання музейных фондаў, аналіз крыніц, шляхоў і гістарычных умоў паступлення прадметаў у музеі дае магчымасць даведацца пра іх спецыфіку, вызначыць прыярытэты, якія стаялі перад вучэбнымі музеямі, а таксама высветліць, якія арганізацыі дапамагалі ў камплектаванні фондаў, хто быў у ліку дарыльшчыкаў, як самі супрацоўнікі музея папаўнялі экспазіцыі.

Аснова музейнага фонду – калекцыя, якая ўяўляе сабой «збор музейных прадметаў, навукова-дапаможных і сыравінных матэрыялаў, аб'яднаных адной або некалькімі прыметамі, які мае навуковую, гістарычную, мемарыяльную, мастацкую і (або) эстэтычную каштоўнасць як адно цэлае»[1]. Фарміраванне музейных фондаў у кожнай установе адбываецца па-рознаму. Калекцыі многае могуць распавесці пра гісторыю стварэння і дзейнасць музея.

*Мэта* дадзенага артыкула – выявіць асноўныя тэндэнцыі фарміравання фондаў музеяў вышэйшай школы БССР у 1920–30-я гг. Адпаведна мэце пастаўлены наступныя *задачы*:

1) вызначыць асноўныя крыніцы паступлення прадметаў у музеі БДУ;

2) ахарактарызаваць ролю дзяржаўных органаў, навуковай супольнасці і грамадскасці ў фарміраванні музейных калекцый.

Для ўсебаковай характарыстыкі даследуемага пытання прыцягваліся агульнанавуковыя метады аналізу, сінтэзу, апісання, класіфікацыі з апорай на прынцып гістарызму. Такім чынам, гісторыя фарміравання музейных фондаў разглядалася ў канкрэтных гістарычных умовах і прадстаўлена ў артыкуле як цэласная з'ява.

У савецкі перыяд пытанне камплектавання фондаў музеяў вышэйшых навучальных устаноў БССР разглядалася Э. І. Ціхаміравай, Б. А. Савельевым, У. Г. Хадзецкім і іншымі даследчыкамі і асвятлялася ў кантэксце вывучэння музеяў вышэйшай школы СССР [1]. Статыстычныя звесткі і справаздачы аб фондавай рабоце, якія не закраналі тэарэтычных пытанняў камплектавання музейных фондаў, былі прадстаўлены ў перыядычных выданнях і справаздачах вышэйшых навучальных устаноў БССР, асобных публікацыях у газетах «Звязда» і «Савецкая Беларусь»[2], часопісе «Веснік Народнага камісарыята асветы». Сёння гісторыя ўзнікнення і развіцця вучэбных музеяў, прынцыпы іх узаемадзеяння з вышэйшымі навучальнымі ўстановамі фрагментарна прадстаўлены ў даследаваннях А. А. Гужалоўскага [2; 3]. Гістарыяграфічны агляд паказаў, што комплекснае даследаванне, прысвечанае гэтай праблеме, не праводзілася. У артыкуле асновай гістарыяграфічнай базы з'яўляюцца матэрыялы фонду 205 Нацыянальнага архіва Рэспублікі Беларусь, у якім захоўваюцца дакументы пра гісторыю дзейнасці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта.

## Асноўная частка

Калекцыі ўніверсітэцкіх музеяў БССР пачалі фарміравацца ў першыя гады функцыянавання вышэйшых навучальных устаноў. Асобнае месца ў станаўленні беларускай навукі і культуры займаў БДУ. Пасля абвяшчэння 1 студзеня 1919 г. Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі Беларусь, ва ўмовах нацыянальна-дзяржаўнага будаўніцтва, 25 лютага 1919 г. Выканаўчым Камітэтам БССР быў прыняты дэкрэт «Аб адкрыцці Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў г. Мінску»[3]. Аднак у сувязі з падзеямі Савецка-польскай вайны і акупацыяй Мінска ў 1919–1920 гг. урачыстае адкрыццё ўстановы адбылося 11 ліпеня 1921 г., а заняткі пачаліся 30 кастрычніка 1921 г. на рабочым, медыцынскім факультэтах і факультэце грамадскіх навук. У 1922 г. быў адкрыты педагагічны факультэт. Навуковую, вучэбную і выхаваўчую дзейнасць універсітэт ажыццяўляў і праз свае музеі: заалагічны, мінералагічны, гісторыка-археалагічны музеі, а таксама музеі атэізму і гісторыі першабытнай культуры і музеі медыцынскага факультэта. Нагляднасць у працэсе спасціжэння асноў прыродазнаўчых і гуманітарных навук забяспечвалі фондавыя калекцыі, фарміраванне якіх адбывалася рознымі шляхамі.

Адной з форм паступлення калекцыі ў музей з'яўлялася *перадача ў дар* ад арганізацый ці асоб. Фарміраванне з такіх крыніц сістэматызаваных калекцый, якія адносіліся да канкрэтных навуковых дысцыплін, было асновай для стварэння шэрагу музеяў. Асноўнымі дарыльшчыкамі выступалі навукоўцы. Напрыклад, у аснову заалагічнага музея лягла асабістая калекцыя заснавальніка беларускай заалагічнай школы А. У. Фядзюшына. Анатоль Уладзіміравіч 30 чэрвеня 1921 г. выступіў перад часовым праўленнем універсітэта з прапановай аб перадачы «ў распараджэнне БДУ для музея яго

[1]Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры ад 20 ліп. 2016 г. № 413-З [Электронны рэсурс]. URL: http://www.pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413 (дата звароту: 03.06.2019).
[2]Перыядычны друк Беларусі да 1945 года [Электронны рэсурс]. URL: https://opac.preslib.org.by:8080/abis/simpleSearch.do (дата звароту: 12.03.2019).
[3]Дэкрэт ЦВК БССР «Аб стварэнні Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ў г. Мінску» [Электронны рэсурс]. URL: https://time.bsu.by/ru/bsu-hist/bsu-history/1921-1941/prolog-1919-1920/arkhivnye-dokumenty/101-dekret-tsvk-bssr-ab-stvarenni-belaruskaga-dzyarzha-naga-universiteta-g-minsku.html (дата звароту: 21.02.2019).

сабраных падчас экспедыцыі ў вяршыні рэк Белы і Чорны Іюс Енісейскай губерні ў 1920 г. калекцый найбольш рэдкіх птушак, скурак асаблівага падвіду курапаткі і чырвонай качкі турпан і гербарыя байкальскай флоры»[4] (тут і далей пераклад наш. – *Д. П.*). Аднак з перадачай дадзенай калекцыі паўсталі праблемы: яе матэрыялы былі згублены падчас перавозкі ў БДУ. У 1926/27 навучальным годзе ад вучонага ў дар музею былі перададзены 6 скурак птушак, сабраных у Енісейскай і Табольскай губернях, і калекцыя з пудзіл 16 птушак, сабраная ў Мінскай губерні[5].

Яшчэ адной асабістай калекцыяй, перададзенай у дар універсітэту для стварэння мінералагічнага музея, з'яўляўся збор інжынера Н. Ф. Бліядуха (быў запрошаны ў БДУ ў якасці выкладчыка мінералогіі і геалогіі). Згодна з пратаколам пасяджэння праўлення БДУ ад 25 лютага 1922 г., на перавозку калекцыі з Барнаула было запатрабавана 500 млн руб. Універсітэт выдаў неабходную суму пры ўмове, што Народны камісарыят асветы БССР «прыме выдаткі па дастаўленні ў г. Мінск мінералагічнай калекцыі Бліядуха на свой рахунак і пагасіць доўг БДУ пры першай магчымасці. Адпушчаныя пры такіх умовах Бліядуху 500.000.000 руб. лічыць выдадзенымі ў пазыку Наркамасветы як абавязак апошняга БДУ»[6]. Фінансавы доўг быў аддадзены летам 1922 г. Народны камісарыят асветы БССР адпусціў БДУ 400 млн руб. на перавозку калекцыі. Праўленне ўніверсітэта пастанавіла: «У дадатак да пастаноў БДУ ад 12 і 25 ліпеня выдаць выкладчыку Бліядуху чатырыста мільёнаў рублёў на ўмовах, выкладзеных у пастанове праўлення БДУ ад 25 ліпеня і рэзалюцыі Наркамасветы ад 26 ліпеня»[7]. Калекцыі, нягледзячы на часовыя цяжкасці, трапілі ў музеі ўніверсітэта. Яны былі добра сістэматызаваны і не патрабавалі далейшай апрацоўкі.

Музейныя калекцыі перадаваліся і з іншых навучальных устаноў. Так, у 1922 г. на пасяджэнні Прэзідыума калегіі Галоўнага ўпраўлення прафесійнай адукацыі РСФСР у сувязі з ліквідацыяй Віцебскага і Смаленскага аддзяленняў Маскоўскага археалагічнага інстытута было прынята рашэнне перадаць БДУ яго маёмасць, кніжныя і музейныя зборы[8]. На падставе выпіскі з пратакола ад 15 жніўня 1922 г. № 95 «Аб перадачы маёмасці Смаленскага і Віцебскага аддзяленняў Маскоўскага археалагічнага інстытута БДУ» праўленне ўніверсітэта 9 верасня 1922 г. пастанавіла наступнае: «Арганізаваць камісію для выпрацоўкі мерапрыемстваў па перавозцы маёмасці азначаных аддзяленняў у г. Мінск, у складзе праф[есараў] У. І. Іванаўскага, М. М. Нікольскага, сябра праўлення У. І. Корсака і заг[адчыка] Дзярж[аўнай] і ўніверс[ітэцкай] бібліятэкі І. Б. Сіманоўскага»[9]. У 1922 г. прафесары М. М. Нікольскі ў Смаленску і У. М. Перцаў у Віцебску займаліся адборам гістарычных рарытэтаў для музея і бібліятэкі БДУ.

Прыкладам дарэння служыць перадача ў 1922/23 навучальным годзе хімічных прэпаратаў, рэактываў, прыбораў, калекцыйных прадметаў і шэрагу медыкаментаў ад прадпрыемства «Ара», Народнага камісарыята аховы здароўя БССР, пастэраўскай станцыі і Чырвонага Крыжа медыцынскаму факультэту БДУ[10]. Дадзеныя ахвяраванні заклалі пачатак калекцыі фармакалагічнай лабараторыі.

Летам 1939 г. археалагічнымі музеямі Керча, Херсона і Феадосіі ў дар БДУ былі перададзены экспанаты, якія ляглі ў аснову створанага ў 1940 г. гісторыка-археалагічнага музея. Гэтаму музею Дзяржаўны Эрмітаж падарыў калекцыю старажытнагрэчаскіх, візантыйскіх і рымскіх манет[11].

Фонды музеяў папаўняліся і праз *навуковыя экспедыцыі*, арганізаваныя супрацоўнікамі ўніверсітэта. Адной з іх асноўных задач быў збор мінералагічных, батанічных, заалагічных, археалагічных, этнаграфічных матэрыялаў, якія перадаваліся ў музеі БДУ. Гэтыя калекцыі былі сістэматызаваны і адрозніваліся высокім навуковым зместам.

Яшчэ да пачатку першых заняткаў ва ўніверсітэце быў заслуханы даклад гуртка беларусаў – студэнтаў Пятроўскай сельскагаспадарчай акадэміі аб адпраўцы летам студэнцкай экспедыцыі ў Беларусь для збору матэрыялаў і падрыхтоўкі навуковых калекцый для БДУ. З пратакола пасяджэння камісіі па арганізацыі Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта ад 8 сакавіка 1921 г. вядома, што па п. 8 «Аб стварэнні навуковых калекцый для патрэб выкладання і вывучэння ў БДУ» было пастаноўлена наступнае: «Прыцягнуць да экспедыцыі ўраджэнцаў Беларусі, студэнтаў і студэнтак іншых маскоўскіх вышэйшых навучальных устаноў»[12]. Адпраўка планавалася на лета 1921 г. у Бабруйскі, Барысаўскі, Ігуменскі, Мазырскі, Мінскі і Слуцкі ўезды. Экспедыцыя павінна была праходзіць на высокім навуковым узроўні, таму быў намечаны план падрыхтоўчых работ: «Арганізацыя баз, дзе будуць сканцэнтраваны срод-

---

[4]Нац. арх. Рэсп. Беларусь (далей – НАРБ). Ф. 205. Воп. 1. Спр. 8384. Арк. 10.
[5]*Федюшин А. В.* Три месяца из жизни медицинского факультета БГУ // Вестн. Нар. Комиссариата Просвещения. 1922. № 2. С. 15.
[6]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 14.
[7]Там жа. Арк. 24.
[8]Там жа. Спр. 51. Арк 14.
[9]Там жа. Спр. 10. Арк. 33.
[10]Белорусский государственный университет в 1922–1923 учебн. году (итоги и перспективы) / сост. С. З. Каценбоген. Минск : 1-я Гостипогр. «Белтрестпечать», 1923. С. 33.
[11]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1150. Арк. 3.
[12]Там жа. Спр. 2. Арк. 100 адв.

кі харчавання, рыштунак перамяшчэння і дзе будуць канцэнтравацца сабраныя матэрыялы для іх сістэматызацыі і магчыма апрацоўкі… правядзенне для ўдзельнікаў экспедыцыі кароткатэрміновага курса для навуковай і тэхнічнай падрыхтоўкі»[13]. Прафесарам А. А. Барзову, Н. А. Янчуку і Н. М. Улагіну быў даручаны пошук навуковых кіраўнікоў экспедыцыі, распрацоўка праграм курса і экспедыцыйных груп, складанне каштарыса неабходнага навукова-тэхнічнага рыштунку.

З заявы прафесара А. А. Барзова вядома, што перад экспедыцыяй былі пастаўлены дзве задачы: «Па-першае, збор сырых матэрыялаў па ўсіх царствах прыроды, як то: натураліі, маналіты, фатаграфіі, профілі і г. д; па-другое, апісанне краю з асабліва падрабязным вывучэннем бліжэйшых да г. Мінска раёнаў з мэтай вылучэння асабліва каштоўных і ў экскурсійным дачыненні мясцовасцей»[14]. Экспедыцыя праходзіла пад кіраўніцтвам спецыялістаў па ўсіх галінах прыродазнаўства. Кіраўнікі падрыхтавалі неабходны інструментарый і рыштунак: «Упаковачныя матэрыялы, фатаграфічныя прыналежнасці, посуд, спірт, прадукты харчавання»[15]. Сабраны матэрыял лёг у аснову калекцый універсітэцкіх музеяў.

Навуковыя экспедыцыі з'яўляліся не толькі базай для стварэння першых калекцый, але і крыніцай папаўнення музейных фондаў. Так, 30 чэрвеня 1921 г. заолаг А. У. Фядзюшын звярнуўся ў часовае праўленне БДУ з прашэннем даручыць яму на ліпень – жнівень 1921 г. збор арніталагічнай калекцыі ў Мінскай губерні з умовай, што яна паступіць у заснаваны пры ўніверсітэце музей. Анатоль Уладзіміравіч прасіў выдаць яму адпаведныя дазволы на права навуковага палявання і набыццё патрэбных харчоў, а таксама аванс на куплю некалькіх неабходных кніг па арніталогіі ў Маскве[16]. Вясной 1924 г. была арганізавана экспедыцыя ў Віцебскую, Магілёўскую і Мінскую акругі. Ажыццяўлялася яна з дазволу Савета народнага камісарыята БССР, фінансавалася ім жа: была выдзелена сума ў «адну тысячу трыста пяцьдзясят рублёў для вытворчасці даследаванняў і вывучэння фаўністычных асаблівасцей краю»[17]. За 1925 г. у межах БССР А. У. Фядзюшыным было сабрана звыш 1000 птушак[18]. Калекцыі паступілі ў заалагічны музей БДУ.

Яшчэ адным прыкладам камплектавання фондаў на аснове экспедыцыйнай працы стаў збор калекцыі гісторыка-археалагічнага музея. Летам 1939 г. былі зроблены шматлікія знаходкі падчас вучэбнай практыкі ў рамках археалагічнай экспедыцыі ў Херсанесе. На адкрыцці музея ў 1940 г. яго загадчык дацэнт У. І. Шаўчэнка, а таксама прафесар М. М. Нікольскі распавялі, як быў арганізаваны збор экспанатаў: «Экспедыцыя студэнтаў і навуковых работнікаў БДУ выязджала на поўдзень СССР на месцы раскопак старажытных гарадоў СССР»[19]. Такім чынам, з мэтай арганізаваць музеі ўніверсітэта на высокім навуковым узроўні экспедыцыі ажыццяўляліся не толькі на тэрыторыі БССР, але і ўсяго Савецкага Саюза.

Акрамя фарміравання музейных фондаў БДУ праз навуковыя экспедыцыі, навукоўцамі ўніверсітэта практыкаваўся яшчэ адзін спосаб папаўнення музейных калекцый – *навуковыя камандзіроўкі*. У маі 1923 г. выкладчык заалогіі А. У. Фядзюшын падаў у праўленне БДУ прашэнне аб камандзіроўцы ў Аляксандраўск-на-Мурмане для заняткаў на Мурманскай біялагічнай станцыі ў чэрвені – ліпені 1923 г. У сваім хадайніцтве вучоны зазначыў, што з мэтай нарыхтоўкі, мантажу, упакоўкі і перавозкі сабранага для калекцый БДУ матэрыялу яму неабходная дапамога асістэнта А. М. Зубковіча, якога таксама трэба камандзіраваць[20]. У пачатку ліпеня хадайніцтва было задаволена кіраўніцтвам універсітэта[21]. У жніўні 1923 г. у праўленне БДУ ад А. У. Фядзюшына паступіла справаздача аб камандзіроўцы на Мурманскую біялагічную станцыю, з якой вядома, што быў сабраны значны матэрыял для навуковай працы[22].

У тым жа годзе прафесарам С. З. Кацэнбогенам была здзейснена навуковая камандзіроўка ў Маскву, дзе адбыліся перамовы з археолагам В. А. Гарадцовым аб перадачы экспанатаў па археалогіі з Маскоўскага гістарычнага музея[23] ў музей атэізму і гісторыі першабытнай культуры БДУ. У 1924 г. была падпісана дамова з мастацкай майстэрняй наглядных навучальных дапаможнікаў пры Петраградскім губернскім аддзеле народнай адукацыі, якая брала на сябе абавязак па вырабе 350 мадэлей, адноўленых з арыгіналаў прадметаў па гісторыі першабытнай культуры, «егіпецкай і будыйскай рэлігіі», якія захоўваліся ў Дзяржаўным Эрмітажы і Расійскай акадэміі навук у Ленінградзе. Акрамя гэтага, у Ленінградзе было закуплена спецыяльнае абсталяванне, шафы, вітрыны, падстаўкі і тумбы[24]. У красавіку 1924 г. у аддзел прапаганды і агітацыі

[13]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 2. Арк. 100 адв.
[14]Там жа. Спр. 1. Арк. 33.
[15]Там жа.
[16]Там жа. Спр. 8384. Арк. 19.
[17]Там жа. Арк. 47.
[18]Там жа. Арк. 50.
[19]Адкрыццё гісторыка-археалагічнага музея // Звязда. 1940. 12 лют. (№ 35). С. 4.
[20]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 8384. Арк. 31.
[21]Там жа. Арк. 32.
[22]Там жа. Арк. 34.
[23]Там жа. Спр. 77. Арк. 37.
[24]Там жа. Спр. 79. Арк. 10.

Цэнтральнага бюро КП(б)Б паступіла паведамленне ад прафесара С. З. Кацэнбогена аб дзейнасці музея атэізму і гісторыі першабытнай культуры пры БДУ, дзе было адзначана, што ў музеі прадстаўлены «Егіпет, Асіра-Вавілонія, першабытная культура (каменны і бронзавы вякі), а таксама будызм і прымітыўныя рэлігійныя культы (вядзьмарства, шаманізм і інш.)»[25], у сувязі з гэтым музею надавалася велізарнае культурнае значэнне ў прапагандзе антырэлігійнай палітыкі партыйна-дзяржаўных структур.

Вучоныя БДУ выязджалі ў навуковыя камандзіроўкі не толькі ў саюзныя рэспублікі, але і за мяжу. У ліпені 1925 г. прафесару С. З. Кацэнбогену праўленнем універсітэта быў выдадзены дазвол на камандзіроўку ў Германію для «закупкі разнастайных прадметаў абсталявання па антрапалогіі і археалогіі і для вывучэння музеяў па гісторыі першабытнай культуры і этнаграфіі» тэрмінам да 15 кастрычніка 1925 г.[26] Такім чынам, практычны вопыт Саламона Захаравіча ў галіне дзейнасці музеяў вышэйшых навучальных устаноў Германіі лёг у аснову развіцця музеяў БДУ.

Распаўсюджанай для музеяў вышэйшых навучальных устаноў крыніцай папаўнення калекцый з’яўляліся *вучэбныя майстэрні, у якіх студэнтамі і выкладчыкамі выраблялiся музейныя прадметы*. Так, музей Інстытута нармальнай анатоміі БДУ ў 1922/23 навучальным годзе быў папоўнены «сухімі прэпаратамі сасудзістай і нервовай сістэмы верхняй канечнасці (Перэльман); ніжняй канечнасці (Барухін); сасудзістай сістэмы ўсяго цела (Усманаў); прэпаратамі касцяных паўкругавых каналаў *in situ* чалавека, каня, сабакі, свінні і крата (Лябёдкін) і некалькімі рэдкімі прэпаратамі па асцеалогіі»[27]. У 1923 г. пры прапедэўтычнай клініцы медыцынскага факультэта быў арганізаваны музей, які складаўся з паталага-анатамічных прэпаратаў, атрыманых пры аперацыі[28]. На кафедры фармакалогіі БДУ выкладчыкам рабочага факультэта К. В. Фальковічам была зроблена спроба сканструяваць аналагі імпартных апаратаў: «кімограф, пнеўмограф, электрамагнітны вызначальнік часу». Яны выкарыстоўваліся як дэманстрацыйныя мадэлі ў музеі фармакалагічнай лабараторыі[29]. Са справаздачы кафедры агульнай паталогіі і паталагічнай анатоміі вынікае, што лекцыі суправаджаліся дэманстрацыяй «як свайго здабываемага на ўскрыццях матэрыялу, так і з музейных прэпаратаў»[30]. Агульная колькасць прэпаратаў і мадэлей па анатоміі складала звыш 184 адзінкі[31].

Дадзены метад актыўна выкарыстоўвалі пры папаўненні сваіх калекцый не толькі музеі медыцынскага факультэта. У 1922 г. прэпаратарам заалагічнага музея М. У. Дабратворскім быў выраблены шэраг прэпаратаў «для мікраскапіравання – 220 шт., набіта і манціравана (з сухіх салёных скурак) – 150 птушак, пудзілаў – 3 шт., набіта і манціравана скурак млекакормячых – 18 шт., знята і апрацавана скурак птушак – 223 шт., фармалінавых і спіртавых прэпаратаў – 13 шт., закансервавана для музею – каля 1000 адз[інак] розных жывёл»[32]. Акрамя таго, быў выраблены матэрыял для практычных работ (больш за 1000 аб’ектаў) і некалькі прэпаратаў у шкляных футаралах: «Шкілеты змяі, малюскаў, крабаў і інш.»[33].

Спосабам камплектавання фондаў з’яўляўся *абмен калекцыямі*, які практыкаваўся сярод галіновых музеяў. Згодна са справаздачай аб навуковай і вучэбнай дзейнасці кафедры заалогіі, у 1926/27 навучальным годзе выкладчык А. У. Фядзюшын арганізаваў абмен паміж заалагічнымі музеямі Расійскай акадэміі навук у Ленінградзе і БДУ. Ва ўніверсітэт былі перададзены калекцыі птушак, сысуноў, рэптылій, абалонкавых, ракападобных, павукоў і інш.[34] Гэта дазволіла паказаць ва ўніверсітэцкім музеі прадстаўнікоў птушак з усіх зоагеаграфічных абласцей зямнога шара. Для абмену мясцовымі аб’ектамі фаўны былі ўсталяваны партнёрскія кантакты з замежнымі заалагічнымі музеямі ў Мексіцы і Калькуце[35].

Фарміраванне фондаў ажыццяўлялася і праз *афіцыйнае набыццё*. Фінансаванне ўніверсітэтаў, у тым ліку кабінетаў і музеяў, уключаючы папаўненне калекцый і абсталяванне, ажыццяўлялася Народным камісарыятам асветы БССР. Іх загадчыкі прадстаўлялі свае заяўкі на разгляд дэканам факультэтаў і ў праўленне БДУ. Так, перад паездкай у навуковую камандзіроўку ў Аляксандраўск-на-Мурмане ў маі 1923 г. выкладчык А. У. Фядзюшын у хадайніцтве кіраўніцтву БДУ адзначаў, што для набыцця калекцыі яму неабходна пэўная сума грошай, прадугледжаная ў каштарысе кафедры заалогіі: «10 мільярдаў руб. савецкімі знакамі, лічачы кошт 10 руб. золатам, у той час 15 000 000 руб. савецкімі знакамі». Далей Анатоль Уладзіміравіч пісаў, што «ў выпадку, калі нельга зараз атрымаць гэтых

[25]НАРБ. Ф. 4-п. Воп. 1. Спр. 1168. Арк. 17.
[26]Там жа. Ф. 205. Воп. 3. Спр. 3615. Арк. 13.
[27]Белорусский государственный университет в 1922–1923 учебн. году (итоги и перспективы) / сост. С. З. Каценбоген. Минск : 1-я Гостипогр. «Белтрестпечать», 1923. С. 32.
[28]Там же. С. 30.
[29]Там же. С. 33.
[30]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 1041. Арк. 11.
[31]Там жа. Арк. 16.
[32]Там жа. Спр. 2542. Арк. 7.
[33]Там жа.
[34]Там жа. Спр. 8384. Арк. 72 зв.
[35]Там жа.

грошай або дзён за 5 да выезду (неабходна спецыяльная ўпакоўка посуду і спірту, для чаго вырабляюцца асаблівай формы скрыні), то прашу выдаць адпаведную суму з іншых крэдытаў у кошт каштарысу кафедры заалогіі»[36]. У пачатку ліпеня хадайніцтва было задаволена: член праўлення І. У. Герчыкаў перадаў 15 тыс. руб. (у чырвонцах па курсе)[37]. Згодна са справаздачай аб камандзіроўцы, «набыта купляй непасрэдна ў станцыі не менш за 200 відаў марскіх жывёл у колькасці звыш адной тысячы асобнікаў»[38]. У канцы 1924 г. А. У. Фядзюшыну таксама была выдадзена сума ў 500 руб. на навуковае абсталяванне для пакупкі ў Маскве і Ленінградзе кніг, экскурсійнага рыштунку і матэрыялаў для складання ўзораў дапаможнікаў на кафедры методыкі прыродазнаўства.

У 1939/40 навучальным годзе рэктар БДУ П. П. Савіцкі ў дакладзе аб стварэнні і дзейнасці ўніверсітэта ва Усесаюзны камітэт па справах вышэйшай школы пры Савеце народных камісараў прадставіў звесткі аб працы музеяў: «Экспанаты гэтых устаноў бесперапынна папаўняюцца, прычым… найбольшае развіццё атрымліваюць тыя з іх аддзелаў, якія адлюстроўваюць непасрэдна беларускі матэрыял»[39]. У тым жа годзе замежнымі навукоўцамі, якія наведалі БДУ, была дадзена ацэнка дзейнасці музеяў, абсталяванне якіх «знаходзілася на ўзроўні лепшых замежных універсітэтаў»[40].

## Заключэнне

Працэс фарміравання фондаў музеяў вышэйшых навучальных устаноў БССР пасля Кастрычніцкай рэвалюцыі 1917 г. быў абумоўлены палітыкай савецкай дзяржавы. Асноўнай формай дзейнасці такіх музеяў была асветніцкая работа, якая не магла ў поўнай меры ажыццяўляцца без стварэння навукова арганізаваных калекцый.

Шляхі фарміравання калекцый музеяў БДУ ў 1920–30-я гг. былі розныя. Выяўлены наступныя напрамкі: 1) многія музейныя калекцыі фарміраваліся дзякуючы дарыльшчыкам з ліку вучоных, буйных музеяў, навучальных і навуковых устаноў, арганізацый; 2) фонды папаўняліся сіламі прафесарска-выкладчыцкага складу і студэнтаў універсітэта ў ходзе розных навуковых экспедыцый, камандзіровак, а таксама вырабам музейных прадметаў у вучэбных майстэрнях; 3) у працэсе абмену і афіцыйнага набыцця, што ў сілу адсутнасці абменных фондаў і слабага фінансавання ўніверсітэта адбывалася вельмі рэдка. Спалучэнне розных форм і кірункаў фарміравання фондаў музеяў БДУ забяспечыла ўніверсітэт сістэматызаванымі, навукова арганізаванымі вучэбнымі калекцыямі.

Музеі ўніверсітэта змаглі сфарміраваць уласныя калекцыі дзякуючы энтузіязму навукоўцаў, супрацоўніцтву з рознымі музеямі, навучальнымі і навуковымі ўстановамі, арганізацыямі як на тэрыторыі СССР, так і за мяжой. Якасная і колькасная характарыстыка, паўната і сістэмнасць калекцый вызначылі высокі навуковы ўзровень музеяў БДУ, што трывала ўвайшлі ў вучэбна-навуковую базу ўніверсітэта, без якой была б немагчымай падрыхтоўка маладых спецыялістаў як тэхнічнай, так і гуманітарнай адукацыі.

## Бібліяграфічныя спасылкі

1. Тихомирова ЭИ, Савельев БА, Ходецкий ВГ, составители. *Музеи высших учебных заведений СССР*. Москва: Издательство Московского университета; 1975. 235 с.
2. Гужалоўскі АА. *Нараджэнне беларускага музея*. Мінск: НАРБ; 2001. 123 с.
3. Гужалоўскі АА. *Музеі Беларусі (1918–1941 гг.)*. Мінск: НАРБ; 2002. 176 с.

## References

1. Tikhomirova EI, Savel'ev BA, Khodetskii VG, compilers. *Muzei vysshikh uchebnykh zavedenii SSSR: Annotirovannyi spravochnik* [Museums of higher educational institutions of the USSR: Annotated guide]. Moscow: Publishing House of the Moscow State University; 1975. 235 p. Russian.
2. Huzhalouski AA. *Naradzhjenne belaruskaga muzeja* [Birth of the Belarusian Museum]. Minsk: National Archives of the Republic of Belarus; 2001. 123 p. Belarusian.
3. Huzhalouski AA. *Muzei Belarusi (1918–1941 gg.)* [Museums of Belarus (1918–1941)]. Minsk: National Archives of the Republic of Belarus; 2002. 176 p. Belarusian.

*Артыкул паступіў у рэдкалегію 05.04.2019.*
*Received by editorial board 05.04.2019.*

[36]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 8384. Арк. 31.
[37]Там жа. Арк. 32.
[38]Там жа. Арк. 49.
[39]Даведка рэктара БДУ П. П. Савіцкага ва Усесаюзны камітэт па справах вышэйшай школы пры СНК СССР «Аб стварэнні і дзейнасці ўніверсітэта» [Электронны рэсурс]. URL: https://time.bsu.by/by/bsu-hist/bsu-history/1921-1941/ispytaniya-1930-1941/arkhivnye-dokumenty/560-davedka-rektara-bdu-p-p-savitskaga-va-sesayuzny-kamitet-pa-spravakh-vyshejshaj-shkoly-pry-snk-sssr-ab-stvarenni-i-dzejnastsi-universiteta.html (дата звароту: 22.02.2019).
[40]НАРБ. Ф. 205. Воп. 1. Спр. 10. Арк. 24.